**5 клас**

**1. Пазнайце часціну мовы па апісанні.** (1 бал)

а) абазначае дзеянне;

б) выконвае ролю выказніка;

в) змяняецца па асобах і ліках.

**2. Пастаўце дзеясловы ў неазначальнай форме.** (4 балы)

Плыло –

Стаялі –

Пасядзеў –

Загаварыў –

**3. Вызначце, колькі разоў паўтараецца [э] у словах тэлеграма, тэлефон, гардэроб, ордэн.** (6 б.)

**4. Разгадайце загадку. Зрабіце гукавы запіс слова-адгадкі.** (2 балы)

Узор: лёд [л´от ].

Адгадаць няцяжка, дружа: ён мяккі, пульхны і душысты,

Бывае чорны, белы і нават калі-нікалі падгарэлы.

**5. Выпішыце словазлучэнні, вызначце ў іх галоўнае і залежнае словы.** (4 балы)

Прыйшла восень, залатыя дзянькі, па грыбы, іду ў лес, свеціць сонейка, напоўнены водарам, ісці весела.

**6. Устаўце прапушчаныя літары.** (6 балаў)

Б..розы, бя..шумны, разве..чык, камп'ют..р, пра..дзівы, с..нажаці.

**7. Са словам <u>*свята*</u> складзіце сказы, каб яны былі розныя па мэце выказвання.** (4 балы)

**8. Суаднясіце прозвішчы пісьменнікаў і творы.** (3 балы)

| | |
|---|---|
| 1. Яўгенія Янішчыц | А. "Калі ласка" |
| 2. Уладзімір Караткевіч | Б. "Мова" |
| 3. Пятрусь Броўка | В. "Бацькаўшчына" |

**9. Якой назвы народнага свята не хапае ў вершаваных радках У.Дубоўкі?** (1 бал)

Ёсць цудоўнае паданне,

як на свята, на ...,

ад паўночы да світання

кветку шчасця ў нас шукалі.

1. Каляды. 2.Узвіжанне. 3. Троіца. 4. Купалле.

**10. Пра які жанр вуснай народнай творчасці ідзе размова.** (1 бал)

Апавяданне фантастычнага або бытавога зместу з шырокім выкарыстаннем вымыслу.

**5 клас**

**Варыянт 2**

**1. Падзяліце словы на склады.** (4 балы)

Працавітыя, моладзь, певень, героі.

**2. Падкрэсліце словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае.** (2 балы)

Закон, дапамагаць, заданне, воўк.

**3. Адкажыце на пытанні адным словам.** (3 балы)

1. Які падоўжаны гук абазначаецца трыма літарамі?

2. Якую частку слова заўсёды знойдзеш у зямлі?

3. Якое слова складаецца з сямі гукаў, а паказвае на 32 літары?

**4. Перабудуйце сказ у пабуджальны.** (1 бал)

Я люблю чытаць народныя казкі.

**5. Ад дадзеных слоў утварыце прыслоўі.** (6 балаў)

Раніца, восень, гурт, дзень, ніз, бок.

**6. Пабудуйце словазлучэнні, якія б адпавядалі наступным схемам. Пазначце галоўнае слова.** (6 б)

"прым.+наз.", "наз.+наз.", "дзеясл.+наз."

**7. Вызначце скланенне назоўнікаў множнага ліку.** (7 балаў)

1)сосны, 2) трактароў, 3) яблыні, 4) мядзведзі, 5) зорак, 6) гарадам, 7) начамі.

**8. Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы.** (6 балаў)

Хто любіць__________________, той не будзе доўга________________.

Дзе гультай_________________, там ніва __________________________.

Хочаш быць ________________, не будзь __________________________.

**9. Колькі назваў гарадоў у вершаваных радках Петруся Броўкі?** (2 балы)

Мая Айчына – поле, нівы,

Над Нёманам зялёны гай,

Прыгожы Брэст і Мінск шумлівы –

Уся Беларусь, ад краю ў край.

**10. Запішыце назвы казак, з якіх узяты наступныя радкі.** (3 балы)

1. "Пайшоў бядняк на рэчку па ваду. Аж бачыць – ляжыць у кустах цялушка".

2. "Пасля гэтых слоў разбойнікі падхапіліся са сваіх месцаў і, палахліва азіраючыся па баках, назаў-

сёды пакінулі абжытыя мясціны".

3. "Воўк зарадаваўся і пайшоў з сабакам да людзей служыць".

**5 клас**

**Варыянт 3**

**1. Прыдумайце і запішыце сказы, якія маюць такія схемы.** (3 балы)

**1. [ ], і [ ]. 2. [ ], [ ]. 3. [ ], (бо ).**

**2. Расстаўце знакі прыпынку ў вершы.** (2 балы)

Сыплецца мяккі пушысты сняжок

Белаю коўдрай накрыўся лужок

Лес нерухома стаіць за сялом

І рэчка замоўкла пад тоўстым ільдом.

**3. Разбярыце словы па саставе.** (3 балы)

Птушкі, маладая, зазімак.

**4. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.** (5 балаў)

Пройтись по лесу, закон о языках, беспокоиться о дочери, гулять у реки, сказать сквозь слёзы.

**5.Падбярыце па сэнсе прыметнікі і дапасуйце да назоўнікаў** (пастаўце ў адпаведным родзе, ліку і склоне). (8 балаў)

…лес, …сцяной, па…небе, …воблакі, …туманам, у …вадзе, у …красках, па …рацэ.

**6. Выпішыце словы, у якіх не супадае колькасць гукаў і літар, падлічыце іх.** (5 балаў)

Вакзал, знікнуць, задача, футбол, бярлог, малацьба, дзядзька, узмор’е, здароўе.

**7. Укажыце пары слоў з аднолькавымі канчаткамі.** (2 балы)

Сонечны – дажджы, полымя – сталовая, снягоў – кароў, акно – паліто, зімы – двары.

**8. Дапішыце народныя прыкметы.** (3 балы)

1. Летам моцны вецер – будзе… .

2. Зоркі моцна блішчаць – будзе… .

3. Кот ляжыць сярод пакоя – будзе… .

**9. Пазнай героя па апісанні.** (3 балы)

1. А быў ён такі адзіны на ўсю вёску. І было ў яго багата (таксама бедна, але болей, чым у суседзяў, і таму, як воўк за падлу, болей іншых трымаўся ён за Закон), і быў ён самы большы гад. І голас меў у грамадзе.

2. Свята памятала яна матчын запавет, які вельмі строга загадваў хутара не кідаць, на зямлі лён вырошчваць, жыта, каноплі, калодзеж з жывой вадой людзям не аддаваць.

3. З тым і жыў пад Полацкам. Ад вяселля да наваселля, ад радзін да хрэсьбін, ад свята сонца да свята марозу: з дня ў дзень, з года ў год працай славіў свой род.

**10. Хто з вядомых мастакоў слова сказаў: "Казкі вучаць родную мову любіць, на крылах**

**юнацтва ўздымацца пад хмары, з няпраўдай змагацца, а з праўдай дружыць…"?** (1 бал)

1. Янка Купала. 2. Максім Багдановіч. 3. Максім Танк. 4. Пятрусь Броўка.

**5 клас**

**Варыянт 4**

**1. Напісанне супадае з вымаўленнем ( 1 ) ці не супадае ( 2 )? Упішыце адпаведную лічбу. (6 б.)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| а) бязводны | | г) мільён | |
| б) зялёны | | д) персідскі | |
| в) лёгкі | | е) стог | |

**2. Устаўце прапушчаныя літары.** (6 балаў)

Аб..граць, каман..ір, кр..васмок, м..даль, ра..сыпаць, бізнесм..н.

**3. Запішыце словы па-беларуску.** (4 балы)

Бактерия – , аллея - , аквариум - шницель –

**4. Графічна пазначце ў словах аснову.** (5 балаў)

Абутак, ацэнка, бескарыслівы, зімой, прачытаеш.

**5. Падкрэсліце з прапанаваных слоў сінонім(-мы) да назоўніка <u>фальш.</u>**(3 балы)

Падман, ашуканства, падробка.

**6. Фанетыка – раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца… . Выберыце патрэбныя варыянты.** (4б)

Склад, будова слова, націск, інтанацыя, гукі.

**7. Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае ў сказе слова?** (1 бал)

У дружбе **жыць** – такі закон спрадвеку ў народзе.

**8. Закончыце прыказкі, падабраўшы патрэбныя дзеясловы.** (4 балы)

1. Навуку вывучай і дзедава слова _____. 2. Век жыві, век _____. 3. За пытанне _____ні адзення, ні снядання. 4. Лішняе гаварыць – толькі справе ____-..

**9. Устаўце прапушчаныя словы ў вершаваныя радкі. Назавіце аўтара і твор.** (6 балаў)

Здароў, ___________, звонкі вечар!

Здароў, скрыпучы, __________снег!

Мяцель ___________, сціхнуў вецер,

І волен_______________ санак бег.

**10. Вызначце вобразны выяўленчы сродак мовы.** (1 бал)

Мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе прадмет, з'яву, чалавека.

**5 клас**

**Варыянт 5**

**1. Якія гукі ў беларускай мове не маюць спецыяльных літар?** (3 балы)

**2. Падкрэсліце пары слоў, у якіх націск дапамагае адрозніць іх значэнне.** (2 балы)

стала – стала　　　　туга - туга

выразаць – выразаць　　　　прызнаюся - прызнаюся

**3. Пастаўце націск у словах.** (7 балаў)

Агент, адзінаццаць, балаваць, бульбяны, дачыста, звычай, крапіва.

**4. Пазначце колькасць мяккіх гукаў у словах.** (4 балы)

| | | | |
|---|---|---|---|
| а) збягаць | | в) надзея | |
| б) згінуць | | г) незалежнасць | |

**5. Расстаўце знакі прыпынку.** (7 балаў)

Дрэвы сынок упрыгожваюць наша жыццё і дораць чалавеку радасць гаварыла маці

**6. Падкрэсліце толькі назоўнікі мужчынскага роду.** (4 балы)

Жаль, фальш, немач, продаж, гар.

**7. Падкрэсліце назоўнікі, утвораныя суфіксальным спосабам.** (4 балы)

Лясок, горка, кніжка, маладосць.

**8. Адгадайце народныя загадкі.** (4 балы)

1. Рук многа, а нага адна.

2. Сярод поля іскаркі блішчаць.

3. У вадзе купалася, ды сухой засталася.

4. Не рыба, а плывец, не конь, а ходзіць, не піла, а рэжа.

**9. Назавіце аўтара наступных твораў: “Крыніца”, “На рэчцы”, “Песня ляснога жаваранка”.** (1 бал)

**10. Суаднясіце аўтара і твор.** (4 балы)

| | |
|---|---|
| 1. А Астрэйка | А. “Кропля” |
| 2. М.Багдановіч | Б. “Верасень” |
| 3. П.Броўка | В. “Над ракой” |
| 4. А.Грачанікаў | Г. “Як ападае ліст” |

**6 клас**

**Варыянт 1**

1. **Спісаць, падзяляючы тэкст на сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. У сярэдзіне, дзе неабходна, і ў канцы сказаў паставіць патрэбныя знакі прыпынку. (10 балаў)**

Самая цікавая кніга

Якая самая **цікавая** кніга на с..ве..е гэта кніга – зямля, на якой мы **ж..вём** яна з ран..яга **маленства** вучыць нас ..історыі мове адкр..вае нам усё **новыя** і новыя словы кожны ..ень мы вуч..мся **спазнаваць** і разуме..ь значэ..е гэтых слоў усё, што **акружае** нас, мае свае імёны **тыс..чы** і **міл..ёны** назва.. існуюць на **з..млі** кожная яе м..сціна мае сваю назву **ч..лавеку** дарага ўсё што пакінулі аб сабе яго **про..кі** пам..ць з..млі **бераж..**. гэта як **найдараж..йшую** спа..чыну і н..се праз в..кі ў імёнах у назвах у словах у **пада..ях** і л..г..ндах.

**2. Выпісаць спачатку словы, у якіх звонкія зычныя аглушаюцца, а пасля – словы, у якіх глухія зычныя азванчаюцца. (6 балаў)**

Грузчык, грыбкі, дзядзька, касьба, малацьба, мароз, незабудка, перапісчык, склад, стог, указка, футбол.

**3. Паставіць націскі ў словах. (10 балаў)**

Крапіва, вусы, адзінаццаць, прызыўнік, прадзед, фартух, спіна, сантыметр, грамадзянін, навіна.

**4. Падабраць сінонімы са значэннем станоўчых рыс характару чалавека. (7, 5 бала)**

а) чалавек, надзейны ў сяброўстве; б) чалавек, упарты ў дасягненні мэты; в) чалавек працавіты; г) чалавек смелы.

Словы для даведак: адважны, настойлівы, працавіты, шчыры, мужны, упарты, добры, бясстрашны, стойкі, прыяцельскі, геройскі, старанны, смелы, сяброўскі, рашучы.

**5. У наступных словах абазначыць марфемы. (4 балы)**

Жытні, асілак, засуха, пладовы, разгром, сход, прырэчны, пасылка.

**6. Вызначыць, да якой часціны мовы адносяцца выдзеленыя ў тэксце (заданне 1) словы**.

*Узор запісу.*

Назоўнік: сонца, паветра, ... .

**7. Вызначыць род назоўнікаў і дапісаць канчаткі прыметнікаў. (15 балаў)**

Беларуск.. жывапіс, вугальн.. пыл, шырок.. далонь, калмат.. сабака, гумав.. галёш, сучасн.. моладзь, народн.. суддзя, балюч.. мазоль, калгасн.. шафёр, мал.. дзіця, цудоўн.. настрой, паветран.. струмень, вялік.. зала, каротк.. запіс, залат.. медаль.

**8.Перакласці словазлучэнні з рускай мовы на беларускую. (7 балаў)**

Два завода, четыре новых стихотворения, шесть зданий, одиннадцать переводчиков, двадцать три года, пятьдесят отрядов, сорок четыре ученика.

**9.Тут пераблытаны часткі прыказак і прымавак. Знайдзіце пачатак і канец кожнай з іх і запішыце. ( 10 балаў)**

| | |
|---|---|
| Як гукнеш, | што каго чакае. |
| Згода будуе, | певень ды кошка. |
| З вялікага грому | а той, хто дае. |
| Як ляжа спаць, | то і цябе пашануюць. |
| Слоў мяшок, | нязгода руйнуе. |
| Не той багаты, хто мае, | малы дождж. |
| От багат Цімошка: | так і адгукнецца. |
| Шануй людзей, | а спраў на вяршок. |
| Ніхто наперад не знае, | то забудзецца ўстаць. |
| І ў вераб'я | сэрца ёсць. |

**10. Вызначце жанр запісаных твораў.** (1,6 бала; за кожны правільны адказ – 0,2)

1. "Прыехала Каляда на белым кані…";
2. А.Ставер."Жураўлі на Палессе ляцяць";
3. "Цар Ірад";
4. Кузьма Чорны "Насцечка";
5. Якуб Колас. "Конь і сабака"
6. "Палешукі і палевікі";
7. Якуб Колас "Жывая вада";
8. "Прытча пра блуднага сына".

**6 клас**

**Варыянт 2**

**1. Пазначыць, у якіх раздзелах навукі пра мову вывучаюцца гук, марфема, слова, словазлучэнне, сказ. (5балаў)**

Гук - _____Марфема -_____Слова - _____Словазлучэнне -_____ Сказ -_____

**2. Падкрэсліць гукавыя абрэвіятуры. (4 балы)**

ГУМ, БДУ, ВКЛ, ААН, МУС, СНІД, АТК,МТЗ, ЗАГС, БДТУ, СНД, ЕШКА, МАЗ, БАМ, МГЛУ.

**3. Падкрэсліць зборныя назоўнікі. (5 балаў)**

Вінегрэт, садавіна, пушніна, лазняк, куп'ё, апілкі, студэнцтва, варэнне, маліннік, асака, калоссе, сыр, бярвенне, валакно, люд, галлё.

**4. Запісаць лічбы словамі. (6 балаў)**

З 253 рублямі - _________, каля 38 абітурыентаў - __________, перад 86 вучнямі - __________, каля 42 кніг - _______, пад 59 дрэвамі - _______, звыш 560 аркушаў - ___________.

**5. Выпісаць асобна з кожнага сказа займеннікі і вызначыць іх разрад. (7 балаў)**

1. Хто людзям не верыць, той і сабе веры не дасць.2. Жаласць да самога сябе агарнула Пракопа. 3.Такому чалавеку можна верыць, можна было б і даручыць што-небудзь важнае, неабходнае.

**6.Некаторыя ўласныя назоўнікі сёння ўжываюцца ў значэнні агульных. Напрыклад: мартэн - печ, у якой атрымліваюць сталь (мартэнаўская печ). Названа іменем французскага мелалурга Мартэна. Патлумачце значэнне і паходжанне слоў мецэнат,фартуна,вулкан. (3 балы)**

Мецэнат - ________, фартуна -________, вулкан - __________.

**7.Замяніць словазлучэнні адным словам-адпаведнікам. (10 балаў)**

Наведавальнік тэатра - ___________, наведвальнік магазіна - ____________, наведвальнік паліклінікі - _____________, наведвальнік бібліятэкі - _____________, асоба, якая гуляе ў футбол, - ______________, асоба, якая займаецца барацьбой сумо, - ______________, асоба, якая аб'яўляе і вядзе праграму канцэрта, - _______________, асоба, якая займаецца паслугамі каго-небудзь або чаго-небудзь, - ________________, асоба, якая карыстаецца якім-небудзь абанементам, - __________________, асоба, якая робіць паездку на грамадскім транспарце, - __________________.

**8. Уставіць у прыказкі патрэбныя словы, якія з'яўляюцца назвамі частак маўленчага апарату. Растлумачыць сэнс прыказак. (6 балаў)**

1. Чужы кусок дзярэ _____________.

2. ______________ да Кіева давядзе.

3. У каго згуба, у таго граху поўна __________________.

4. Не вер ________________ - палажы на ______________.

5.Сказанага слова да ____________ не вернеш.

6. Казаў бы па-нямецку, дык __________грэцкі.

**9.Са слоў, якія знаходзяцца ў дужках, выберы патрэбнае, каб утварыць словазлучэнне, і падкрэслі яго. (10 балаў)**

Гартаць (сена, зямлю, часопісы), варочаць (горы, сена,сшыткі), адчыніць (школу, сход, дзверы), адкрыць (канферэнцыю, кнігу,акно), статак (акунёў, сабак, кароў), чарада (людзей, гусей, ваўкоў), табун (тараканаў, курэй, коней), касяк (дарослых, акунёў, грыбоў), гайня (сабак, птушак, змей), неруш (грыбоў, пісьменнікаў,гарадоў).

**10. Перакласці рускамоўныя словазлучэнні на беларускую мову адным словам.(8 балаў)**

Пребывание в гостях - _____, впасть в детство - _____, напиток из берёзового сока - _____, детёныш белки - _____, католический монастырь - _____, потерять сознание - ______, гнездо аиста - _____, детёныш медведицы - _____.

**6 клас**

**Варыянт 3**

**1. Замяніце лічбы словамі. Дзе магчыма, выкарыстайце зборныя лічэбнікі. Назоўнікі пастаўце ў адпаведнай форме: (10 балаў)**

6 (студэнт), 67 (кілаграм), 1,5 (вядро), 8 (вясёлыя дзяўчаты), 5 (цяляты), 4 (чалавек), 7 ( сані), 173 (тона), 9 (ягня), 2 ( суткі)

**2. Падкрэсліце словы, у якіх літары дз і дж абазначаюць адзін гук: (6 балаў)**

Падземны, ураджай, дзеці, адзвінець, падзорны, джэм, джунглі, дзесьці, дзяўчына

**3. Знайдзіце ў кожным радзе чацвёрты "лішні" прыметнік. Абгрунтуйце сваю думку. (4 балы)**

а) прыгожы, шкляны, вялікі, добры

б) жалезныя ( нервы), драўляны, зімовы, шаўковы

в)мядзведжы (след), братаў, вавёрчын, качыны

**4.Праскланяйце займеннікі ніхто, само. Вызначце іх разрад. (4 балы)**

**5.Запішыце антонімы да выдзеленых слоў. (3 балы)**

Лёгкая задача, лёгкі мароз, лёгкія адносіны да жыцця

**6.Дапішыце беларускія прыказкі. (8 балаў)**

З міру па нітцы…

Сем разоў адмерай…

Новых сяброў нажывай…

Дзе гаспадар ходзіць…

Слова як птушка…

Есць – пацее,…

Не вер казлу ў капусце,….

са свайго языка спусціш - ….

**7.Падкрэсліце абстрактныя назоўнікі. (8 балаў)**

Памяць, кветка, характар, дарога, каханне, жаданне, хвароба, чарната, клімат, смех.

**8.Запішыце назоўнікі ў творным склоне. (5 балаў)**

Сібір, Об, верф, гар, ноч, В. Быкаў, Брэст, палі, кураняты, стараста

**9.Спішыце, замяняючы лікі словамі. ( 6 балаў)**

1.123+456=579

2.345+237=582

3.982 – 768=214

**10.Пералічыце сродкі мастацкай выразнасці мовы. Запішыце прыклады да іх. (7 балаў)**

**6 клас**

**Варыянт 4**

**1. Выпішыце абстрактныя назоўнікі. (1.   (0,5 б. за слова)**

Памяць, кветка, характар, дарога, каханне, жаданне, хвароба, чарната, клімат, смех.

**2. Вызначце ў кожным радку лішняе слова.  Дайце тлумачэнне. ((0,5 б. за выпісанае слова і 0,5 б. за тлумачэнне)**1) Свежы, новы, белы, дзіцячы; 2) цукар, асіннік, кісларод, цэмент; 3) восемдзесят тры, тысяча восемсот пяцьдзясят   два, дзевяцьсот семдзясят чатыры, шэсцьдзясят; 4) працую, будуем, рамантуем, світае.

**3. Выпішыце спачатку словы, у якіх1) звонкія зычныя аглушаюцца, а пасля –2) словы, у якіх глухія зычныя азванчаюцца. (0,5 б. за слова)**Грыбкі, дзядзька, касьба, малацьба, мароз, незабудка, склад, стог, указка, футбол.

**4.Перакладзіце словазлучэнні з рускай мовы на беларускую. (10 балаў)**  Два завода; четыре новых стихотворения; одиннадцать переводчиков; двадцать три года; пятьдесят отрядов; сорок четыре ученика;  яблоки вкуснее груш;  мёд слаще сахара;  клюква крупнее брусники;  Дима старше своего брата.

**5.Перапішыце словазлучэнні, замяніўшы лічэбнікі словамі. (5 балаў)** 1) Энцыклапедыя з (888 + ілюстрацыя) ; 2) паход працягваўся (4 + суткі) ; 3)  дамова з (98 + краіна) ;

4) з  (978 + карыстальнік  інтэрнэта); 5) горад з (300 000 + насельніцтва)

**6. Запішыце  назоўнікі ў форме Р. склону. (8 балаў)** Талент, мёд, дэсерт, вобраз, хлеб, гурток, мільён, уздым.

**7.Ад назоўнікаў, што ў  дужках, утварыце  прыналежныя прыметнікі. (10 балаў)**  ( Старшыня) пасада,  (Антось) кніга,  (зязюля) гняздо,  (Купала) рука, (Міця) сшытак,  (Ганна) апавяданне, ( Хамёнак) хутар, (Наташа) сяброўка,  (мядзведзь) лапа,  (вавёрка) лапа.

**8. Выпішыце  назоўнікі, якія можна скласці з гукаў [а], [б], [в], [г], [р], [о], [ы], [т], выкарыстоўваючы любыя камбінацыі гэтых гукаў. (8,5 бала)** Герой, горы, вораг, роў, Рыг, раб, бор, Бог, багор, горб, горад, рот, торг, брыво, рог, вароты, грады.

**9.Растлумачце значэнні фразеалагізмаў адным словам. (8 балаў)** Абуць у лапці – ___Лёгкі на язык – ____Мазоліць вочы – ____Насіць на руках – ____Рукой падаць – ___Хоць вока выкалі – _------Кляваць носам – ______Навастрыць вушы –_______

**10. Назваць аўтара і твор, з якога ўзяты радкі. (5 балаў)** 1.Дружба – вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць…                    2. Лёня Саўчанка і Грыша Міхневіч вучыліся ў адным класе… У школе ўсе казалі, што іх вадой не разальеш.

3.… А вясна даганяла зіму;

Заяц скочыў у лужу блакіту,

Бо на хвост наступіла яму,

І пралескі распырскаў, раскідаў.

4.Каб любіць Беларусь нашу мілую,Трэба ў розных краях пабываць.

5.Белай істужкай цягнуліся лебядзіныя стаі  над багнамі, лясамі, сінімі азёрамі, лугамі, над усёй мілай зямлёй сваёй, дзяліліся, ляцелі ў розныя бакі.

**6 клас**

**Варыянт 5**

**1.Падкрэсліце словы, у якіх побач знаходзяцца два галосныя гукі. (3 балы)**

Маёр, лаўрэат, аазіс, саюзнік, каланіяльны, вераб'іны, рытуал, Клеапатра, піяніна, іанізацыя, баец, серыял, тэарэма.

2. **У наступных словах абазначце марфемы. (4 балы)**

Жытні, асілак, засуха, пладовы, разгром, сход, прырэчны, пасылка

3. **Вызначыць род назоўнікаў і дапісаць канчаткі прыметнікаў. (10 балаў)**

Беларуск.. жывапіс, вугальн.. пыл, шырок.. далонь, калмат.. сабака, гумав.. галёш, балюч.. мазоль, мал.. дзіця, паветран.. струмень, вялік.. зала, каротк.. запіс.

4. **Падкрэсліце прыметнікі, ад якіх нельга ўтварыць ступені параўнання. (3 балы)**

Малады, новы, малочны, свежы, залаты, сыраваты, яснавокі, дарагі, сухі, крэмавы, чысты, нізкі, мядзведжы, прыгожы, тонкі

5. **Замяніце выдзеленыя спалучэнні адным словам. (6 балаў)**

Адна другая чайнай лыжкі; адна з паловай шклянкі адвару; адно з паловайвядра малака; сто пяцьдзясят чалавек; прайшло адзін з паловай года; адна з паловай старонкі кнігі

**6. Выпісаць нумары складаных назоўнікаў і прыметнікаў, якія пішуцца разам або праз злучок.**

1. Мікра клімат, 2. Залаціста жоўты, 3. Паў лімона, 4. Гідра служба, 5. Кафэ рэстаран, 6. Вечна зялёны, 7. Жар птушка, 8. Глуха нямы**(8 балаў)**

**7.Перакласці словазлучэнні з рускай мовы на беларускую. (6 балаў)**

Два завода, четыре новых стихотворения, шесть зданий, одиннадцать переводчиков, двадцать три года, сорок четыре ученика

**8.Растлумачце сэнс фразеалагізмаў. (4 балы)**

а) сем пятніц на тыдні;1)апынуцца ў недарэчным становішчы;

б) блудзіць у трох соснах; 2)хто хутка мяняе сваё рашэнне;

в)паміж двух агнёў; 3) блытацца ў самых простых пытаннях;

г) іграць у адну дудку 4)быць заадно з кім-небудзь

**9.Суаднясіце аўтараў і іх творы. (4 балы)**

А. Паўлюк Трус 1. "Нямоглы бацька"

Б. Кузьма Чорны 2. "Сябры"

В. Алена Васілевіч 3. "Падаюць сняжынкі"

Г. Уладзімір Караткевіч 4. "Насцечка"

**10.Складзіце сінквейн " Празаічны твор". (5 балаў)**

Ключавое паняцце________.Два азначэнні________.Тры дзеясловы_______.Фразаз чатырох слоў_______.Слова-сінонім_________

**7 клас**

**Варыянт 1**

**1. Выпішыце са сказа словы, якія маюць толькі па два мяккія зычныя гукі.**

Нічыіх кніг не бывае – у кожнай ёсць аўтар ці аўтары, кожная па-свойму цікавая, пазнавальная.

**2. Вызначце нумары слоў, у якіх націск падае на другі склад.**

1) фурманка; 2) крыху; 3) навіна; 4) імя; 5) слабы.

**3. Адзначце, якую часціну мовы ў пачатку XX-га стагоддзя называлі "рэчавік"?**

1) прыназоўнік; 2) займеннік; 3) прыметнік; 4) назоўнік; 5) лічэбнік.

**4. Адзначце беларускія прыказкі, значэнне якіх адпавядае рускамоўнаму выслоўю "На вкус и цвет товарища нет".**

1. Дзеду міла, а ўнуку гніла.

2. Як няма мяса, то і грыб закраса.

3. Каму – як балота, а каму – як золата.

4. Не памогуць чары, як каму хто не да пары.

5. Хто любіць гарбуз, а хто агуркі.

**5. Вызначце ў сказе словы, якія спрагаюцца. Запішыце іх ў пачатковай форме.**

З усіх канцоў свету збіраюцца госці на свята, і свята спявае, скача.

**6. Дапішыце патрэбныя словы, зрабіце іх марфемны разбор. Запішыце, як называюцца прапушчаныя словы.**

| | |
|---|---|
| Скажу я словачка | Скажу я словачка |
| Высока, | Далека, |
| А ты адкажаш | А ты адкажаш |
| ……. | …….. |

**7. Замяніце словазлучэнне *вучань чацвёртага класа* аднаслоўным адпаведнікам.**

**Запішыце гэтае слова.**

**8. Батлейка – беларускі народны тэатр. Для яго характэрна:**

а) шырокае выкарыстанне народных песень, танцаў, а таксама строгае захаванне біблейскай традыцыі;

б) спалучэнне рэлігійных і свецкіх, побытавых сюжэтаў у касцюміраваным прадстаўленні;

в)спалучэнне рэлігійных і свецкіх, побытавых сюжэтаў у лялечным прадстаўленні;

г) выкананне спектакляў у стацыянарным тэатры, паводле строгага раскладу, які друкаваўся на афішах.

**9. Пра пэўны твор вядома, што ён напісаны вершаванай мовай; у ім два цэнтральныя персанажы – конь і сабака, аднак яны надзелены рысамі чалавечага характару, вядуць паміж сабой дыялог; дзеянне разгортваецца так, што адзін з персанажаў трапляе ў камічную сітуацыю, і аўтар робіць з гэтага павучальную выснову для чытачоў. Гэты твор паводле жанру:**

а) апавяданне; б) байка; в) паэма; г) казка.

**10. Біблію называюць "кнігай кнігаў", бо ў ёй заключаны досвед чалавецтва, глыбокі маральны і выхаваўчы змест. Біблейскія вобразы і матывы паслужылі асновай для шматлікіх твораў сусветнай літаратуры і мастацтва. Сярод найбольш пашараных біблейскіх сюжэтаў:**

"Стварэнне свету", "Песня песняў", "Прытча пра ……………сына", "Зыход" і інш.

7 клас

Варыянт 2

**1. Запішыце словы ў фанетычнай транскрыпцыі. (5 балаў)Узор:** адшумець — [атшум'эц'].

Людскі, ад'езд, возчык, лётчык, счарсцвелы, салаўі, прыязджаць, купаешся, разжыцца, ласьён**.**

**2. Ад прапанаваных словазлучэнняў утварыце складаныя прыметнікі. Запішыце. (4 балы)**

Чорныя валасы, тоўстыя крылы, доўгі хвост, устойлівы да цяпла, дзвесце гадоў, добрая якасць, добрае сэрца, босыя ногі.

**3. Знайдзіце сярод прапанаваных словазлучэнняў тыя, у якіх парушана лексічная спалучальнасць слоў, запішыце іх правільна. (5 балаў)Узор:** пісьмённы стол — пісьмовы стол, пасадзіць дрэўка — пасадзіць дрэўца.

Адукаваны чалавек, жыллёвы дом, запасны выхад, яблычны сад, гутарлівы стыль, прыгодніцкая аповесць, гарысты ручай, генеральная ўборка, дажджлівы чарвяк, слоўнікавы артыкул.

4. Дапішыце прапушчаныя галосныя ў канчатках назоўнікаў і прыметнікаў. (5 балаў)

Насыпаць аўс.., ружов.. фламінга, сядзіць на лб.., ехаць без педал.., знаходзіцца пры скульптар.., вясёл.. канферансье, каляров.. манпансье, крэсла з дуб.., выняць з кішэн.., вішнёв.. шаль.

**5. Ад наступных слоў утварыце форму множнага ліку і зборныя назоўнікі.** (5балаў)

Колас, бервяно, пяро, ліст, бяроза, птушка, сук, студэнт, купіна, дзіця.

**6. Выпішыце словазлучэнні, у якіх адносныя і прыналежныя прыметнікі ўжываюцца ў значэнні якасных. (4 балы)**

Сярэбраны ланцужок, лісіная хітрасць, кляновы ліст, залаты характар, жалезная логіка, даільны апарат, школьны сад, буслінны клёкат, воўчы апетыт, сонечны настрой, летняя спёка, крыштальнае сумленне, бронзавы загар, курыная нага, курыныя мазгі.

**7. Запішыце лічбы словамі. (7 балаў)**

Праехаць каля 600 кіламетраў, у кнізе звыш 250 старонак; нарадзіўся ў 2007 годзе; самалёт з 243 пасажырамі, сустрэцца на 235 кіламетры; прачытаць 2/3 кнігі; 35-тысячны наведвальнік.

**8. Што азначаюць дадзеныя фразеалагізмы?(5 балаў )**А. Сыр-бор разгарэўся: 1) разгарэліся мокрыя дровы; 2) падняўся шум, перапалох; 3) пачаўся ўрачысты сход . Б. Завязаць сабе свет: 1) уступіць у шлюб; 2) запамінаць, улічваць на будучыню; 3) рабіць сваё жыццё несвабодным і бязрадасным. В. Конь не валяўся: 1) парадак, чысціня; 2) нічога не зроблена, не падрыхтавана; 3)наравісты незацугляны конь. Г. Табаку важыць: 1) драмаць; 2)старанна

працаваць; сноўдацца без справы, лодарнічаць. Д. Даваць лататы: 1) моцна сварыцца на каго-небудзь, біць; 2) ленавацца, бяздзейнічаць; 3) кідацца наўцёкі, уцякаць. Е. Клюнуць на вудачку: 1) паддацца на падман; 2) драмаць; 3) знайсці выхад з цяжкага становішча. Ё. Як назаўтра трэба: 1) вельмі хутка, тэрмінова; 2) даўно; 3)вельмі марудна, зусім не спяшаючыся. Ж. Мух ганяць: 1) ісці хістаючыся; 2) караць каго-небудзь, небалюча б'ючы, звы- чайна для выгляду; 3)сноўдацца без справы, лодарнічаць. 3. У свіныя галасы: 1) з вялікім спазненнем; 2) загадзя; 3) гучна спяваць. І. Сабаку з'еў: 1) украў, ашукаў некага; 2) страціў сілу, заняпаў; 3) набыў вялікі вопыт, навык у нечым

9. **Суаднясіце словы і прыведзеныя значэнні. Запішыце адпаведныя лічбы.** (5 балаў)

| | |
|---|---|
| А. Гіпербала<br>Б. Метафара<br>В.Параўнанне<br>Г. Эпітэт<br>Д. Алегорыя | 1. Мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе прадмет (з’яву, асобу)<br>2. Характарыстыка аднаго прадмета, з’явы пры дапамозе супастаўлення з іншым на аснове іх падабенства<br>3. Моцнае перавелічэнне ўласцівасцей, якасцей прадмета або з’явы з мэтай большай мастацкай выразнасці<br>4. Іншасказанне; мастацкі прыём, калі нейкая думка ці паняцце перадаюцца праз канкрэтны вобраз — паводзіны жывёлы, асаблівасць расліны, прадмета<br>5. Перанясенне ўласцівасцей адной з’явы на іншую, чым-небудзь падобную на яе |

10.**Пададзены прозвішчы беларускіх пісьменнікаў. Замест пропускаў запішыце іх імёны.** (3 балы) *Багдановіч, Барадулін,Баршчэўскі,Броўка,Караткевіч,Лынькоў.*

**7 клас**

**Варыянт 3**

**1. Уважліва прачытайце сцвярджэнні ў левым слупку, а затым суаднясіце іх з прыкладамі з правага слупка. Адказ запішыце. (5 балаў)**

| | |
|---|---|
| А. Словы з падоўжанымі гукамі<br>Б. Словы з прыстаўнымі гукамі<br>В. Словы, у якіх два аднолькавыя гукі, штостаяць побач, вымаўляюцца як асобныя гукі<br>Г.Словы, у якіх звонкі зычны аглушаецца<br>Д. Словы, пры змене якіх [*л*], [*в*] чаргуюцца з [*ў*] (нескладовым) | 1) казала, спявала, човен;<br>2) клуб, адскрэбла, народ;<br>3) на кладцы, галлё, стварэнне;<br>4) вокрык, імгла, ён;<br>5) паддувала, шматтыражка, аддалі |

**2.Замест словазлучэнняў запішыце ўтвораныя ад іх складаныя прыметнікі. (5 балаў)**

Захад Беларусі, уся ўлада, здольны да жыцця, сярэдзіна сутак, небяспечны агонь, нядобрай якасці, паглынаць святло, тонкае валакно, сем тыдняў, любіць сябе.

**3.Запішыце ў пачатковай форме (адзіночны лік, назоўны склон) назоўнікі, якія прапушчаны ў прыказках.*(*5 балаў)**1. Славіцца хата не вугламі, а **....** 2. Красуе поле пшаном, а гаворка **....** 3. Бог не цяля, бачыць **....** 4. Адзін у полі не **....** 5. Загляне сонца і ў наша **....** 6. Не ведаючы броду, не суньня ў **....** 7. Гаспадарку весці, не **...** плесці. 8. На чужым горы **...** не пабудуеш. 9. У спрэчках нараджаецца **....** 10. … і вада – маладзецкая яда.

**4. Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і замяняючы дзеясловы ў дужках адпаведнымі дзеепрыметнікамі. (5 балаў*)***1. Добры.. в..рсты дз..ве н.. спыняліся не (стрымаць) ______ жарты. 2. Дальнія хво..кі былі (зацягнуць) _______ шыз..й ..мугой. 3. Сенажаці і пал.. (аснежыць) _______, рэкі (высцеліць) _______ гла..кім памостам. Во..к з гу..чару дарогай (наездзіць) _______ б..жыць к вёсцы не (прасіць) _______госц..м. 4. Знаю, крыніцы (гаіць)________ёс..ць на радзімай з..млі. Дал..ю захоплен (бліскаць) ______ , выс..лаў ёй дум караблі. 5. Лежачы на мяк..ай ма..чынай п..рыне пад саматканай, (выбеліць) _______у жлукцэ пос..цілкай, Аўсей пачынаў успамінаць ..ноў і ..ноў тое, што бог ведама калі было.

**5**. **Устаўце прапушчаныя канчаткі. Запішыце словазлучэнні. (5 балаў*)***1) да азіяцк__ поні; 2) з цікав__ фраў, 3) шэр__ галубяня; 4) прыемн__ велікадушнасць; 5) службов__ сабака; 7) бяскрайн__ стэп; 8) старажытн__ рукапіс; 9) свеж__ кальрабі; 10) металічн__ клішэ.

**6. Выпішыце са сказаў перыфразы. Растлумачце іх значэнне. Укажыце сінтаксічную ролю. (9 балаў))** 1. Ляжыць зямля ў адзенні белым, і дрэвы ў шэрані стаяць. (Я. Колас) 2. З-за хмар выплыла на блакітную дарогу велічна прыгожае сонца. (Л. Асіпенка) 3. Збіраліся мы ўсе разам і ішлі росным ранкам ваяваць з травою. (Я. Брыль) 4. Каб умеў кіраваць я пяром, я бы ксёнжку счыркаў як папар. (Ф. Багушэвіч) 5.І я знаю – рань зямнога раю зноў сады ахутае лістотай. (А Пруднікаў) 6. Я мужык-беларус, пан сахі і касы. (Я. Купала)

**7.Выпраўце памылкі ва ўжыванні дзеепрыслоўяў. Запішыце выпраўленыя сказы. (5 балаў)**

1. Убачыўшы Антося, Вераніку быццам нехта падмяніў. 2. Увайшоўшы ў лес, пачаўся збор грыбоў. 3. Выступіўшы на сходзе, класны кіраўнік гаварыў пра падрыхтоўку да Новага года. 4. Увайшоўшы у лес, сонца села. 5. Вучачыся ў школе, у мяне была мара стаць праграмістам.

**8**. **Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Запішыце. (5 балаў)**Послать письмо по адресу, поехать к сестре, приехать через месяц, поехать на мельницу, уход за больным, охранять по ночам, охотиться за волком, раз в неделю, управляющий делами, дышать полной грудью.

**9. Укажыце аўтара і імя гераіні, пра якую напісаны наступныя радкі. (4 балы)**

Я вольная рэчка на вольнай зямлі,

І чыстымі хвалі заўсёды былі …

**10.Запішыце імёны і прозвішчы герояў апавядання М. Лупсякова "Мэры Кэт" (2** балы)

**7 клас**

**Варыянт 4**

**1.Размяркуйце назоўнікі ў .(2,4 балы)**

Далонь, гусь, жывапіс, жэле, непаседа, плакса, сабака, салямі, Баку (горад), ціхоня, жарабя, алібі. Жаночы род Ніякі род Агульны род

Сабака Далонь Жарабя Непаседа

Жывапіс Гусь Жэле Плакса

Баку (горад)	Салямі	Алібі	Ціхоня

**2.Знайдзіце ў вершах амонімы. Растлумачце іх лексічнае значэнне.(2,5бала)**

Розных бабак шмат на свеце.

Тры з іх добра я прымеціў:

Біў адну я малатком,

Еў другую з малаком,

А трэцяя бабка —

Карэньчык ды шапка.Кандрат Крапіва.

Мне цыганка варажыла —

Выцягала з мяне жылы.

Потым я сядзеў на ганку,

З апетытам еў цыганку.Кандрат Крапіва.

**3.Праскланяйце азначальныя займеннікісам, сама, самі, самыя, . (4 балы)**

**4.Ад прапанаваных прыметнікаў, дзе магчыма, утварыце форму простай вышэйшай ступені параўнання. (2,4бала)**

Добры, чалавечы, вялікі, дрэнны, малы, здаровы, летні, доўгі.

**5. Зрабіце марфемны разбор слова (4,8 бала)**

Нямогласць, разуваючыся, угледзеліся, кацяняты, непарушны, чарнеюць, жыццё, выправаджваць.

**6. Выберыце з прапанаваных слоў тыя, якія з’яўляюцца назвамі музычных інструментаў. Зрабіце іх фанетычны запіс. (3,2бала)**

Свісцёлка, кларнет, зруб, гармонік, гуслі, гміна, лыжкі, талеркі, невад, вугольнік з прэнцікам, фуганак, рог

**7. Адзначце сказы, у якіх ёсць фразеалагізмы. Запішыце іх лексічнае значэнне. (2,4бала)**

1. Цяпер я пачынаю разумець, што, рыхтуючы нас на камандзіраў, там даволі моцна закручвалі гайкі (І. Шамякін). 2. У колах аўтамабіля Васіль моцна пазакручваў гайкі. 3. Маці парсючкам дала паесці гарбуза. 4. Ганну асабліва трывожыла тое, што Глушакі — сваты неабыякія, ім не так проста даць гарбуз, паказаць, як ісці, адкуль прыйшлі, ні з чым (І. Мележ). 5. Віця ў адказ каменем кінуў і стаў маўчаць. 6. У нас сяброў усюды шмат, а ўслед — ніхто не кіне камень (У. Дубоўка). 7. Няхай падзякуе яшчэ, што замужам за табой, інакш паказалі б ёй немцы дзе ракі зімуюць (М. Лынькоў).8. На беразе ціхай ракі Міця паказаў сябрам тое месца, дзе звычайна зімуюць ракі.

**8. Выпраўце памылкі, дзе ёсць, ва ўжыванні і напісанні дзеепрыметнікаў. Запішыце іх у адпаведнасці з нормамі сучаснай літаратурнай мовы. (5балаў)**

1. пафарбаванныя сцены; 2)пішучы вучань; 3)зламатая кветка; 4)пішчачая цацка; 5)вывезенныя дровы; 6)прыйшоўшы чалавек; 7)склеяны стол; 8)засеенае поле; 9)падмецены двор; 10)сплецены кошык.

**9. З якімі населенымі пунктамі Беларусі звязаны жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа? Запішыце 5 назваў у месным склоне. (2,5бала)**

Даведкі:Ласток, Нясвіж, Акопы, Альбуць, Пінск, Вязынка, Люсіна.

**10. Вызначце памер вершаванага радка і зрабіце яго схему. (2,4бала)**

Паміж пустак, балот беларускай зямлі... (Янка Купала. «Курган»),

**7 клас**

**Варыянт 5**

**1. Згрупіруйце словы з улікам фанетычных або арфаэпічных асаблівасцей беларускай мовы. Адказ абгрунтуйце. (5,5 бала)**

Завоблачны, навуковы, возера, насенне, ламачча, імгненне, збожжа, глыбокі, вядро, мядовы, шчабятаць, аціналі, вясновы, аржаны, ільдзіна, траўка, лоўка, светлы, зведала, снедала, Мацвей, адвезлі. білецёр, наладзілі, крывава.

**2. Растлумачце праз сінонім або апісальна наступныя словы. (7,5 бала)**

Алегорыя, дойлід, атэлье, кашнэ, імітацыя, іронія, дырэктыва, рэзюмэ, атрамант, асадка, батлейка, вершнік, зёлкі, знічка, мытня.

**3.Запішыце словазлучэнні па-беларуску. (5,5 бала)** Слышать своими ушами; поехать на мельницу; не приехать из-за дождя; читать про себя; идти за грибами; видно по всему; по случаю встречи; кричать во весь голос; гулять по лесу; сходить за отцом; жить в двух километрах от города.

**4. Пастаўце назоўнікі ў форме меснага склону адзіночнага ліку. (10 балаў)**

Лес, стараста, агарод, Рыгор, луг, Янка Купала, суддзя, верх, старшыня, конь, парк, Пецярбург, Алег, сын, герой, двор, стог, паверх, лопух, тварог.

**5.Выпішыце асобна словы з аднолькавымі прыстаўкамі. (7,5 бала)** *Узор: 1) пада-браць, пада-гнаць;2) пад-адзець, пад-агуліць;3) па-даіць.*

Абабегчы, адарыць, адасобіць, адагнаць, абагуліць, абагнаць, адарваць, абабіць, абагрэць, абараць, абагаціць, абараніць, адабрэнне, адагрэць, адазваць.

**6. Растлумачце значэнне фразеалагізмаў. (5 балаў)**

Абрасці мохам, альфа і амега, нагаварыць бочку арыштантаў, арыядніна ніць, ахілесава пята, да трох не гавары, паставіць кропкі над "і", як фенікс з попелу, трымаць порах сухім, кітайская сцяна.

**7. Утварыце ад дзеясловаў дзеепрыметнікі залежнага і незалежнага стану, а таксама адпаведныя дзеепрыслоўі. Абазначце суфіксы. (8 балаў)**

Прынесці, абклеіць, прыдбаць, вызваляць, зжаць, змалоць, зазелянець, пазычыць.

**8.Раскрыйце дужкі. (10 балаў)** 1) мэбля з (дуб); 2) катэгорыі (род,лік,склон) назоўніка; 3) няма (цукар, настрой, хлеб, вецер, грошы); 4) даць (дачка, сястра, студэнтка, маці, Надзея); 5) мы ганарымся (Сібір, Нарач, наш/наша стараста, сваё імя).

**9.Вызначце сказы, у якіх назіраецца няправільнае спалучэнне лічэбніка з назоўнікам. Запішыце правільнае спалучэнне. (4 балы)**

1.Трое настаўніц выехала на нараду. 2. Падводы ехалі па абодвух баках рэчкі. 3. Катлаван капалі двое бульдозераў. 4. Дзве трэціх поля засеяна ячменем. 5. На беразе ракі стаяла чацвёра жанчын. 6. Усе чацвёра хлопцаў скончылі васьмігодку сёлетняй вясной. 7. Падарожніцы спыніліся каля двух прыгожых бяроз. 8. Антось спыніўся ў двух кроках ад нас. 9.Пяцёра трактараў працавала ў полі.

**10.Назавіце аўтара і твор , у якім гаворыцца пра каханне беларуса Івана Цярэшкі і дзяўчыны з Італіі Джуліі.(2 балы)**

**Даведкі**

**7 клас**

**Варыянт 5**

1. 1.Прыстаўныя і ўстаўныя зычныя: завоблачны, навуковы, возера 2.Падоўжаныя зычныя: насенне, ламачча, імгненне, збожжа 3. Фрыкатыўны гук [ г ] : глыбокі, імгненне 4. Аканне (яканне): вядро, мядовы, шчабятаць, ацанілі, вясновы 5. Прыстаўныя галосныя: імгненне, аржаны, ільдзіна 6. Наяўнасць гука [ ў ] : траўка, лоўка 7.Асіміляцыя па мяккасці: светлы, зведала, снедала, Мацвей, адвезлі 8. Дзеканне, цеканне: білецёр, наладзілі, ільдзіна 9. Чаргаванне складоў ро//ры: крывава 10. Зацвярдзелыя гукі: завоблачны, шчабятаць, аржаны 11. Наяўнасць афрыкаты [ дз′] : наладзілі, ільдзіна

2. Алегорыя – іншасказанне, дойлід – архітэктар, атэлье – майстэрня, кашнэ – мужчынскі шалік, імітацыя – падробка, іронія – скрытая насмешка, дырэктыва – пастанова, указ, рэзюмэ – падсумаванне, атрамант – чарніла, асадка – ручка для пісьма, батлейка – вандроўны лялечны тэатр, вершнік – коннік, зёлкі – лекавыя расліны, знічка – зорка, якая падае, мытня – таможня.

3. Чуць на све вушы; паехаць у млын; не прыехаць праз дождж (з прычыны дажджу); чытаць сам сабе; ісці ў грыбы (па грыбы – "на рынак"); відаць па ўсім; з нагоды сустрэчы; крычаць на ўвесь голас; гуляць па лесе; схадзіць па бацьку; жыць за два кіламетры ад горада.

4. У лесе, аб старасце (аб старасту), у агародзе, аб Рыгору, на лузе, аб Янку Купале, аб суддзі, на версе, аб старшыні, на кані, у парку, у Пецярбургу, аб Алегу, аб сыне, аб герою, на двары (на дварэ), на стозе, на паверсе, у лопуху, аб тварагу.

5. Аба-бегчы, аба-біць, аба-гнаць, аба-грэць; аб-агуліць, аб-араць; а-багаціць, а-бараніць, а-дабрэнне, а-дарыць; ада-гнаць, ада-рваць, ада-грэць, ада-зваць; ад-асобіць.

6. Абрасці мохам – адстаць ад жыцця, альфа і амега – сутнасць, самае галоўнае, нагаварыць бочку арыштантаў – нагаварыць многа абы-чаго, арыядніна ніць – сродак выйсця з цяжкага становішча, ахілесава пята – найбольш слабае месца, да трох не гавары – раздражняльны, гарачы, рашучы, паставіць кропкі над "і" – канчаткова высветліць, давесці да канца, як фенікс з попелу – неўміручасць, абнаўленне, адраджэнне, трымаць порах сухім – быць пільным, гатовым да рашучых дзеянняў, кітайская сцяна – неадольная перашкода.

7. Прынесці – прынесены, прынёсшы. Абклеіць – абклеены, абклеіўшы. Прыдбаць – прыдбаны, прыдбаўшы. Вызваляць – вызвалены, вызваляючы. Зжаць – зжаты, зжаўшы. Змалоць – змолаты, змалоўшы. Зазелянець – зазелянелы, зазелянеўшы. Пазычыць – пазычаны, пазычыўшы.

8. 1)мэбля з дубу; 2)катэгорыі роду, ліку, склону назоўніка; 3)няма цукру, настрою, хлеба, ветру, грошай; 4)даць дачцэ, сястры, студэнтцы, маці, Надзеі; 5)мы ганарымся Сібір'ю, Нараччу, нашым старастам, нашай старастай, сваім імем, сваім іменем.

9. Тры настаўніцы, па двух баках рэчкі, два бульдозеры, дзве трэція поля, чатыры жанчыны, каля дзвюх прыгожых бяроз, за два крокі ад нас, пяць трактараў.

10.**В**. Быкаў "Альпійская балада ".